ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987

21 МАЯ

ЧАЦВЕР

№ 18 (1539)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

*ЎЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА*

### «МІНЧАНАЧКА»

з'явілася сёлета на фізічным факультэце па ініцыятыве нашых дзяўчат. Галоўная наша мэта — праверыць сябе ў рабоце. Першыя суботнікі былі праведзены па добраўпарадкаванню роднага факультэта. Яшчэ працавалі на раскопках, узнікшых пры будаўніцтве станцыі метро «Няміга». Цікава было дапамагаць вучоным узнаўляць гісторыю XVI стагоддзя. Ёсць у нас і знаходкі — драўляны грабеньчык ручной работы, фрагменты вырабаў са скуры, кераміка.

Надзейны касцяк атрада складаюць Іра Каралёва, Вольга Зізека, Лена Варабей, Таня Адамовіч, Марына Беніневіч і іншыя. Актыўнасць кожнага байца сёння гарантуе паспяховае выкананне атрадам заданняў трэцяга працоўнага.

Л. МАРКОВІЧ,
камандзір атрада «Мінчанка» фізічнага факультэта.

### КАМІСІЯ

Мінскага гарадскога камітэта КПБ створана пры універсітэце. У цэнтры яе ўвагі пытанне «Аб рабоце па павышэнню эфектыўнасці і навукова-тэхнічнага ўзроўню НДР, пашырэнню маштабаў выкарыстання іх вынікаў у народнай гаспадарцы горада і рэспублікі».

Прапановы камісія просіць дасылаць па адрасу: 220072, Мінск, вул. Сурганава, 6. Сямёнаву Алегу Ігнацьевічу; ці тэлефанаваць па нумару: 20-80-57. Кійко Мікалаю Уладзіміравічу.

І. ВЯРБІЦКІ.

### ПРАВАЗНАЎЧЫЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ

па прававых пытаннях праводзіць штомесячна (кожны першы аўторак з 15.00 да 17.00 у памяшканні прафкома) грамадская юрыдычная кансультацыя.

У неабходным выпадку можа быць аказана дапамога ў састаўленні дзелавых папер прававодга характару.

Кансультацыі бясплатныя.

С. ПІХУН.

### ГАРАДСКІ АГЛЯД

брэйк-дансу запрашае сваіх прыхільнікаў 23 мая ў канцэртную залу рэспубліканскага Палаца культуры прафтэхадукацыі. Білеты можна набыць у палацы (Фабрыцыуса, 5, пакой № 49. Праезд аўтобусамі і тралейбусамі да прыпынку «Вул. Маскоўская» ці метро — ст. «Інстытут культуры»).

А. СЦЯПАНАЎ.

## аўтарытэт па праву



### Надзейнае плячо

*Калі ў паходзе ўдзельнічае такі чалавек, то ведаеш, што палатка будзе пастаўлена ў добрым месцы, што ў час будзе згатаваны абед, што ўсе вернуцца дахаты бадзёрымі, з добрым настроем. Калі Юра бярэцца за якое-небудзь пачынанне, то можна быць упэўненым: ён давядзе яго да канца. Калі ў спрэчку ўмяшаўся Манюк — значыць справа сур'ёзная. Так характарызуюць Юру Манюка яго таварышы, студэнты факультэта прыкладной матэматыкі. І прыслухоўваюцца да яго слова не толькі таму, што ён з'яўляецца намеснікам сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце. Проста студэнты ўпэўнены: Манюк не пабаіцца сказаць праўду у вочы, ніколі не пакрывіць душой. Бадай, нельга назваць хоць адно факультэцкае мерапрыемства, у якім Юра не прыняў бы ўдзел. Таму і карыстаецца ён сярод сваіх таварышаў заслужаным аўтарытэтам, таму і звяртаюцца часта да яго, каб чыстасардэчна пагаварыць, каб высветліць спрэчныя пытанні.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

## КВЗ: патрэбна добразычлівасць

Вось і дакаціўся універсітэцкі КВЗ да фіналу. Восенню мінулага года вясёлыя і знаходлівыя (трэба думаць, самыя з самых) прадстаўнікі нашай універсітэцкай сям'і рушылі ў дарогу за авалоданнем кубкам клуба. І вось фінал звёў фізфак і ФПМ.

# ФІНАЛ

НА IV ПАВЕРСЕ ў мінулую суботу тварылася нешта неверагоднае. З пяці гадзін ужо пачала выстройвацца чарга перад дзвярыма актавай залы. «Калі хочаш заняць лепшае месца,— параіў мне адзін знаёмы,— раней прыходзь. Гэта ж — фінал!»

Я прыйшла раней, але не столькі з-за месца, як з іншай нагоды. У 18 гадзін ужо пачало сваю работу журы. Яго старшыня — кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі механіка-матэматычнага факультэта Віталь Уладзіміравіч Балашчанка склікаў нараду: якую тэму даваць на імправізаваныя конкурсы, абгаварыць некаторыя моманты судзейства. Настройвалі сябе на аб'ектыўнае судзейства члены журы: кандыдат юрыдычных навук, выкладчык кафедры крымінальнага права М. А. Бабій, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры ядзернай фізікі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі С. С. Вятохін, кандыдат фізіка-матэымматычных навук, дацэнт, загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі ФПМ А. Ф. Наумовіч; галоўны канструктар БелНДІ, лаўрэат прэміі Савета Міністраў БССР, капітан каманды КВЗ матэматычнага факультэта — уладальніцы кубка КВЗ сезона 1971—1973 гадоў А. А. Ягораў, капітан каманды КВЗ юрфака, студэнт II курса Юрый Ламека і капітан каманды КВЗ гістфака, аспірант кафедры філасофіі Уладзімір Семянькоў.

Ад прагнозаў перад пачаткам фіналу журы ўстрымалася. Старшыня толькі зазначыў:

— Мы — за якасць!

### ГУЛЬНЯ

ЗАЛА ГУДЗЕЛА, хвалюючыся. То грымелі воклічы: «ФПМ! ФПМ! ФПМ!», то да столі ляцела: «Фізфак! Фізфак!». Лозунгі, усмешкі. Адна палова залы аддадзена ў распараджэнне фізікаў, на другой — гаспадарыць ФПМ. На жаль, гэтая зала так і засталася да канца фіналу раздзеленай — ні смех, ні весялосць не змаглі яе аб'яднаць. Але пра гэта не час гаварыць, бо на сцэну выходзяць каманды. Яны вітаюць журы, балельшчыкаў (гэта ўжо конкурс, ужо фінал). Фізікі больш гаварылі ў сваім прывітальным слове, матэматыкі — ігралі і спявалі (цэлы аркестр на сцэну выйшаў).

Дарагі чытач, калі ты не быў у зале ў той вечар, то табе цяжка ўявіць, як яна бурліла, калі перамаглі ў першым конкурсе фэпээмаўцы. Добра камандзе, калі яе так падтрымліваюць. Фізікаў таксама падтрымлівалі, але, па-мойму, на фізфаку разы ў тры больш студэнтаў, чым сабралася ў зале.

Каманды прыступілі да размінкі. Яны задавалі пытанні, што былі загадзя падрыхтаваны. Пытанні датычалі перабудовы вышэйшай школы, дакладней — трох момантаў перабудовы: дзейнасці адміністрацыі, грамадскіх арганізацый і выкладання грамадскіх дысцыплін. Больш канкрэтнымі, цікавейшымі былі і пытанні, і адказы фізікаў. Журы аддало перавагу ў размінцы ім.

Вось з такім пераменным поспехам пачалася гульня. І кожны конкурс мог павярнуць кола фартуны ці ў бок фізфака, ці ў бок ФПМ.

Атмасфера ў зале накалялася. Дыхаць і ў прамым, і ў пераносным сэнсах было цяжка не толькі таму, што зала была біткам набітая, але і таму, што ў ёй стаяў неверагодны гоман, свіст. Усё гэта паступова стала набіраць адценне нядобразычлівасці, нейкай нават злосці.

Пакуль каманды выконвалі імправізаваны конкурс — пісалі ананімку на сябе ў прэс-цэнтр саперніка, пакуль выступалі прэс-цэнтры (у фізікаў гэта быў тэлемост Філа і Уладзіміра Позніка, у матэматыкаў — чатыры каментатары), да бою рыхтаваліся капітаны: Валянцін Карпушэвіч у камандзе ФПМ і Мікалай Ярош ад фізікаў.

Капітаны падарылі адзін аднаму сюрпрызы і атрымалі заданне даць ім рэкламу: Валянціну прыйшлося рэкламаваць прагноз надвор'я, а Мікалаю — капілку керамічную. Гэта быў першы этап конкурсу, абгавораны напярэдадні.

А вось другі этап заключаўся ва ўменні імправізаваць, яго ўмоў капітаны не ведалі. Яны былі здзіўлены, калі іх запрасілі зрабіць антырэкламу на свой падарунак. Валянцін Карпушэвіч стараўся, спрабаваў нешта зрабіць, але перавага Мікалая Яроша была відавочнай. Ён не толькі праявіў пачуццё гумару, але і сваю знаходлівасць.

Зала дасылала запіскі ў прэс-цэнтр. Так вызначаліся будучыя ўладальнікі прыза сімпатый гледачоў. А каманды ўжо даводзілі да ведама ўсіх тэксты ананімак. Журы іх ацаніла, і прэсцэнтры ўзяліся за разбор ананімных пісьмаў каманд на сябе.

Цікавым быў конкурс «Наш погляд на тэле-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

## урокі дэмакратыі

# Ці лёгка быць дэпутатам

У чэрвені канчаецца тэрмін паўнамоцтваў дэпутата Мінскага гарадскога Савета, студэнта IV курса юрыдычнага факультэта Аляксандра Дземяшкевіча. Якую школу прайшоў за гэтыя два гады малады выбраннік народа? Як прадстаўляў ён у Савеце тых, хто аказаў яму давер?

— ДВА ГАДЫ назад у наш дэпутацкі пакой пры ЖЭС-84 амаль ніхто не заходзіў,— расказвае Аляксандр.— Я спачатку думаў: усё таму, што Паўднёвы Захад — мікраараён новы, людзі толькі прыглядваюцца, што да чаго.

Але вось з'явіліся першыя наведвальнікі. У кагосьці холадна ў кватэры, хтосьці аб добраўладкаванні панадворка клапоціцца, а некаму ўжо рамонт патрабуецца. Нейкі час хадзілі мы, дэпутаты розных рангаў, быццам па зачараванаму колу, па адных і тых жа інстанцыях, вырашаючы падобныя праблемы. А потым сабраліся ўсе разам і вырашылі аб'яднацца ў дэпутацкую тэрытарыяльную групу — бо нас жа 18 чалавек, якія прадстаўляюць у гэтай выбарчай акрузе Саветы ад раённага да гарадскога. Узначаліў яе намеснік галоўнага тэхнолага завода «Калібр» Уладзімір Уладзіміравіч Серадзінскі.

Пачалі з простага: сабралі ў адзіны спіс усе наказы выбаршчыкаў, дыферэнцыравалі іх па значнасці. Гэта выключыла дубліраванне. Адны заняліся пытаннямі добраўпарадкавання, іншыя — дзіцячымі садзікамі, трэція — бытавым абслугоўваннем. У выніку такой «спецыялізацыі» вынікоўвацць намаганняў дэпутатаў рэзка ўзрасла.

Ва ўсіх справах групы дзейны ўдзел прымаў А. Дземяшкевіч. А персанальна ён адказваў за самы бадай што адказны ўчастак — падтрыманне грамадскага парадку.

Саша хутка вызначыў, што сярод парушальнікаў шмат падлеткаў. Таму і зачасціў у бліжэйшыя 154-ю і 160-ю школы. Дамогся ў ЖЭСаў, каб на падворках былі абсталяваны спартыўныя снарады і пляцоўкі для гульняў. Танцавальны гурток адкрыўся крыху пазней і зрабіўся самым папулярным.

Вельмі важнай была для Аляксандра работа ў дні прыёму, калі рашаць даводзіцца самыя розныя, часам нечаканыя пытанні. Неяк у дэпутацкі пакой да Дзямяшкевіча прыйшла Галіна Арцюк, маладая маці. У яе двое маленькіх блізнятак, ды яшчэ двухгадовы сын. Муж ад ранку да позняга вечара заняты на працы. Вось і атрымліваецца бяда з пакупкамі: у чарзе стаяць няма каму, а калі ў магазіне народу няма, дык і тавараў няшмат.

Пад ільготы, прадугледжаныя для шматдзетнай сям'і, сітуацыя не падыходзіла — дзяцей толькі трое. Тым не менш Аляксандр дамогся дазволу Маскоўскага райхарчгандлю на замацаванне Г. С. Арцюк за магазінам.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

## вяртаючыся да надрукаванага

# Шэсць гадоў гульні ў... студэнта

**«Шэсць гадоў гульні ў ...студэнта» — так называўся матэрыял, змешчаны ў № 13 «Беларускага універсітэта» ад 9 красавіка 1987 года. Даволі рэзкімі штрыхамі аўтар намаляваў карціну, якую назірае вось ужо пяць гадоў, вучачыся на завочным факультэце. Ім быў пастаўлены шэраг пытанняў разам з галоўным: «Калі ж наступіць чарга змяненняў і ў завочнай сістэме навучання?».**

**Сёння рэдакцыя друкуе водгукі зацікаўленых чытачоў. Прапануем іх вашай увазе.**

## Неабходны прафадбор

ЯК ПРАВІЛЬНА быў названы матэрыял «Шэсць гадоў гульні ў студэнта» — лепей і не прыдумаеш. Сапраўды, увесь час вучобы падобны на гульню: з выкладчыкамі, метадыстамі, нават паміж самім студэнтамі. Крочым так лёгка па студэнцкай лесвіцы, пераскокваючы з аднаго курса на другі. Асабліва мяне закрануў факт: хто вучыцца? На нашым аддзяленні вучацца людзі настолькі далёкія ад абранай прафесіі, што дзівішся: навошта ім гэта?

Чаму нельга навесці парадак з гэтым і прымаць на аддзяленне толькі тых, хто мае хоць нейкае дачыненне да прафесіі? Мяркуйце самі: няўжо завочніка змогуць за 12 сесій (на большай палове заняткаў студэнт і не прысутнічае) навучыць усяму таму, што павінен ён ведаць як спецыяліст? Для гэтага неабходна практыка. І добрая. А для завочнікаў перш за ўсё.

*Ж. КРУГЛІКАВА,*
*сакратар камсамольскай арганізацыі Магілёўскага тонкасуконнага камбіната.*

## КАМУ АДРАСАВАЦЬ ПЫТАЛЬНІК?

СКАЗАНАГА ў артыкуле «Шэсць гадоў...» ужо дастаткова для таго, каб задумацца. Партрэт «завочнага» жыцця напісаны дакладна і ярка, удасканальваць яго нейкімі сваімі штрыхамі — проста залішне. Праўда, не бяруся сцвярджаць, што ва ўсіх ВНУ студэнты-завочнікі адчуваюць сябе ў такім жа становішчы і маюць такі ж настрой. Але на нашым факультэце (дакладней, аддзяленні) карціна ў агульным іменна такая. Прынамсі, за апошні час становішча настолькі закасцянела, што правесці нейкія змены — проста ў галаву нікому не прыходзіць. Калі я над гэтым задумалася, нават збянтэжылася.

Часта гаворыцца, што кантроль над самім сабой залежыць у першую чаргу ад свядомасці. Так, бясспрэчна. Але... для нас гэта не столькі аксіёма, колькі словы, сэнс якіх недзе згубіўся. Я толькі на II курсе, а незадавальнення ад сваіх адносін да вучобы не адчуваю: не клапоцяць мяне ўжо дакоры сумлення, што магла б вучыцца і лепей. Звыклася, што і так добра? Можа...

Спачатку ўсе мы хацелі сказаць адзін аднаму: «Я прыйшоў за ведамі», а атрымлівалася ўслых: «Я прыйшоў за дыпломам». Вы разумееце, прэстыжнасць ведаў была адразу чамусьці па-за сценамі нашай аўдыторыі! І нікому ад гэтага кепска не было. Нават выкладчыкі спрыялі ўражанню, што вучаць яны нас толькі дзеля таго, каб... хутчэй адвучыць.

Зразумела, ахапіць той матэрыял, што студэнты стацыянара могуць літара за літарай вывучаць, пэўна, год, а мы — толькі 16 гадзін у семестры — не рэальна. Вы тут можаце заўважыць, што у тым і сутнасць завочнага — самаадукацыі. Так, але якую ролю ў такім выпадку адыгрываюць выкладчыкі, акрамя ролі экзаменатара?

На экзамене ўсё залежыць ад уласнай абаяльнасці студэнта, ад колькасці лекцый, якія ён выседжваў дзеля зароку добрай адзнакі, але далёка не дзеля ведаў. Чалавек, які не валодае нават азбукай азначанага прадмета, нават не чуў пра гэтую азбуку (чым прыводзіць у жах сваіх жа сакурснікаў) раптам, выходзячы з аўдыторыі, аб'яўляе: «Выдатна!». Парадокс? Які студэнт дзённага аддзялення можа ўспомніць такое?

Тут я хачу зрабіць вывад, што калі на дзённым сваіх выхаванцаў выкладчыкі бачаць амаль кожны дзень і могуць даволі дакладна ўявіць узровень падрыхтаванасці, то ў нас распазнаць «разумніка» ад сапраўднага сумленнага студэнта — перамога справядлівасці. На маю думку, нашы экзамены і залікі належыць прымаць з павышанай адказнасцю, можа тады меней стане выпадковых, незаслужаных ацэнак.

Аднак не хачу абвінавачваць выкладчыцкі састаў, бо гэта ж яны, нашы выкладчыкі, заплюшчваючы вочы на нашы адносіны да вучобы і, як ім ні баліць за свой прадмет, усё ж дапамагаюць чалавеку атрымаць дыплом.

Колькі вядзецца спрэчак вакол перабудовы вышэйшай адукацыі! Як мы ўсе ўбачылі — праблем хапае. Вырашыць іх зможа перабудова (ёсць такая надзея!), хаця мэта яе некалькі іншая — рэзка павысіць падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў. Чаму ж завочнае абыходзіць гэтую мэту, быццам яна для яго ці дасягнутая, ці наадварот?

Роля рэфарматара, прызнаюся, мне не па сілах. Я толькі хачу ўнесці некалькі канкрэтных і не бескарысных, на мой погляд, прапаноў.

1. Аплачваць дні знаходжання на сесіі толькі пасля паспяховай здачы сесіі. Тым, хто працуе пасля III курса не па спецыяльнасці, сесію наогул не аплачваць.

2. Павысіць самастойнасць студэнтаў у міжсесійны перыяд. Напрыклад, гэтаму б спрыялі больш строгія патрабаванні рэцэнзентаў да кантрольных і курсавых, праверкі якіх на сённяшні дзень нагадваюць гартанне школьных сшыткаў за малодшы клас.

3. Добра было б арганізоўваць афіцыйныя дні завочніка з абавязковай яўкай тых, хто жыве ў гэтым жа горадзе і дзе б студэнта чакаў планава пабудаваны вучэбны дзень з практычнымі, тэарэтычнымі заняткамі.

4. Не залішнім было б арганізоўваць для найбольш працавітых, актыўных студэнтаў навуковыя канферэнцыі, конкурсы, дзе яны б маглі, спаборнічаючы, параўноўваць сваю кваліфікацыю і падрыхтаванасць у абранай прафесіі.

5. Хачу звярнуцца да ўсіх калег-студэнтаў: дакрануцца да самага галоўнага — да ўласнай адказнасці і свядомасці кожнага з нас. Дзяржава дае нам вялікія правы. Дзеля нас круціцца немалы махавік ва ўсёй сістэме навучання. А мы ўспрымаем гэта як належнае. Ды ці не ў табе самім, студэнт-завочнік, самы вялікі пытальнік?

Т. РУДКОЎСКАЯ,
машыністка ЦСУ.

## Крочыць да мэты нялёгка

ПРАЦУ, ВУЧОБУ, ДОМ — як цяжка спалучаць! Вага гэтай ношкі адчуваецца не тады, аднак, калі падаецца заява на завочны. Нават на I курсе завочніку здаецца, што ён маральна падрыхтаваны да будучых выпрабаванняў. Ён аптымістычны і сціплы, як юнкор пасля першай заметкі. Ідэі, планы, задумкі ж... растаюць у быце.

Мне часта даводзіцца чуць ад выкладчыкаў (працую на кафедры) самыя непрывабныя водгукі пра завочнікаў-аднакурснікаў. Неарганізаваныя, недысцыплінаваныя... Слухаю, імкнучыся перавесці гутарку на другую тэму не таму, што на гэтыя эпітэты цяжка запярэчыць. Мая, сумленна гаворачы, даволі сціплая залікоўка не дае права на такую дыскусію.

...Чаго ўтойваць, многія ў нас чакаюць не дачакаюцца таго прыемнага моманту, калі, нарэшце, атрымаюць дыплом і тады... Хто яго ведае, што будзе тады?! Знайсці працу па спецыяльнасці не проста, нават калі за тваімі плячыма ўжо некалькі курсаў. А між тым толькі ў мінулым годзе для абітурыентаў-завочнікаў на аддзяленні журналістыкі ўвялі творчы конкурс. Аднак лічу, што для людзей, якія нярэдка маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, а то і яшчэ адзін дыплом, умовы конкурсу павінны быць больш патрабавальнымі.

Шмат праблем на завочным. Час з імі разабрацца.

Т. ХАМІЦЭВІЧ,
выпускніца завочнага факультэта 1987 года.



## Залежыць ад мяне

АРТЫКУЛ выклікаў абурэнне! Аўтар у іранічнай форме расказвае пра «завочніцкія» недахопы, запрашае паразважаць пра тое, як ад іх пазбавіцца. А на маю думку, зусім не яны перашкаджаюць добра вучыцца асноўнай частцы студэнтаў-завочнікаў, а іх ленасць і абыякавыя адносіны.

Лічу, толькі сам чалавек можа сябе прымусіць вучыцца.

Пра сябе скажу, што я яшчэ не студэнтка, а толькі збіраюся ёю стаць. І хачу пайсці іменна на завочны факультэт. Мне мала верыцца, што я сустрэнуся з намаляванай абстаноўкай. А нават калі і напаткаю яе — галоўнае ўсё ж будзе залежаць ад мяне, майго ўласнага ўсведамлення.

А. САВІЧ,
медыцынская сястра.

## «Даганяю ўпушчанае»

...ПРЫЙШОЎШЫ працаваць па спецыяльнасці, я толькі тады зразумеў, як не хапае тых ведаў, якія мне некалі здаваліся залішнімі!

Іменна цяпер, калі ў нас перабудова, мы не маем права абыякава ставіцца да сваёй прафесіі, ад чаго ў пэўнай ступені залежыць наша перабудова. Бо заўтра мы прыйдзем на вытворчасць, у школу, і там ад нас, як ад спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, справядліва будуць чакаць новага, перадавога. І вельмі сорамна, калі гэтае чаканне так і застанецца ім.

У. ШПАКОЎСКІ,
студэнт-завочнік аддзялення гісторыі.

## завочны факультэт: на шляху перабудовы

# «Мы верым у цябе!»

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ТОЕ, што завочная форма навучання ў большай ступені, чым дзённая і вячэрняя, рэгламентавана інструкцыямі, на завочным факультэце БДУ вядзецца пэўная праца па перабудове вучэбнага працэсу. З гэтай нагоды ажыццяўляецца план мерапрыемстваў завочнага факультэта па выкананню Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай адукацыі ў краіне.**

**З выкладчыкамі, якія працуюць са студэнтамі-завочнікамі, на ўсіх агульнауніверсітэцкіх кафедрах, на саветах і вытворчых нарадах факультэтаў праводзіцца вывучэнне і абмеркаванне пастаноў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, а таксама іншых дакументаў партыі і ўрада па вышэйшай школе. У кожным выпадку мы імкнемся да прыняцця плана канкрэтных мерапрыемстваў па ўдасканаленню сістэмы завочнага навучання ва універсітэце. Вывучэнне і абмеркаванне пастаноў ЦК КПСС і СМ СССР адбудзецца і са студэнтамі на ўсіх аддзяленнях і курсах нашага факультэта.**

**Разам з ВМЦ і НМС ажыццяўляецца комплекс мер, накіраваных на ўдасканаленне планавання і арганізацыі вучэбнага працэсу на факультэце. Вядзецца работа па выяўленню студэнтаў, якія праявілі здольнасці да навуковых даследаванняў. Такія студэнты будуць пераведзены на індывідуальныя, паскораныя планы навучання.**

**Правядзенне кансультацый у міжсесійны перыяд перастае абмяжоўвацца толькі днямі завочніка: для студэнтаў-мінчан і пражываючых у Мінскай вобласці кансультацыі праводзяцца і ў вячэрні час. Колькасць такіх кансультацый будзе павялічвацца. Асаблівая ўвага надаецца ўдасканаленню практыкі выканання кантрольных, курсавых і дыпломных работ з мэтай максімальнай індывідуалізацыі заданняў; па рашэнню кафедр напісанне рэцэнзій замяняецца вусным залікам. Здача кантрольных работ па-за тэрмінамі без уважлівых прычын лічыцца недапушчальнай.**

**Разам з ВМЦ штогод будуць праводзіцца навукова-метадычныя канферэнцыі па завочнаму навучанню, на якіх мэтазгодна абагульняць перадавы вопыт па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. У якасці дакладчыкаў прыцягваюцца найбольш вопытныя прафесары і дацэнты. У мэтах змяншэння перагрузкі студэнтаў у перыяд сесій прызнана неабходным практыкаваць датэрміновую прапрацоўку вучэбнага матэрыялу на лекцыйных, практычных і лабараторных занятках і ў здачу залікаў і экзаменаў у міжсесійны перыяд.**

**Пашыраецца практыка выдання вучэбна-метадычнай літаратуры, якая прызначаецца студэнтам-завочнікам. Мы хадайнічаем перад рэктарам аб выдзяленні завочнаму факультэту ліміту на выданне такой літаратуры ратапрынтным спосабам.**

**Спадзяемся, што названыя і іншыя мерапрыемствы завочнага факультэта па выкананню Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне будуць спрыяць лепшай арганізацыі вучэбнага працэсу на факультэце, а гэта значыць — павышэнню паспяховасці. Што датычыць паспяховасці на сённяшні дзень, то, аналізуючы яе, цяжка выявіць пэўную заканамернасць. Можна толькі адзначыць, што колькасць паспяваючых студэнтаў-завочнікаў узрасла на аддзяленні філасофіі (з 21,5 да 31,1 працэнта) і на аддзяленні беларускай мовы і літаратуруры (з 16,4 да 29,3 працэнта), паменшылася на аддзяленні геаграфіі (з 22,9 да 14,8 працэнта) і на аддзяленні гісторыі (з 23,5 да 21,1 працэнта). Пра адсутнасць стабільнасці сведчыць той факт, што працэнт здаючых на «4» і «5» на аддзяленнях біялогіі, правазнаўства і рускай мовы і літаратуры ў 1984 1985 вучэбным годзе ўзрос у параўнанні з 1983—1984 годам, а ў 1985—1986 годзе зноў паменшыўся. Асаблівую трывогу выклікае якасць падрыхтоўкі журналістаў. На I—II курсах паспяховасць тут складае прыкладна 68 працэнтаў. Гэта можна тлумачыць найперш тым, што на I курс аддзялення залічана толькі 20 працэнтаў працуючых па спецыяльнасці. Прычына дрэннай паспяховасці журналістаў і ў тым, што некаторыя са студэнтаў не вывучалі ў школе беларускай мовы і літаратуры, вывучэнне якіх на аддзяленні абавязковае.**

**Якія асаблівасці прыёму ў Белдзяржуніверсітэт у гэтым годзе?**

**МінВНУ БССР зацверджаны план прыёму ва універсітэт. Ен прадугледжвае 2900 чалавек, з іх 1875 — на дзённую форму, 825 чалавек — на завочную (у параўнанні з 1986 годам — 800 чалавек). У 1986 годзе на завочны факультэт было пададзена 1817 заяў, што складае 2,1 заявы на адно месца. Конкурс на асобныя спецыяльнасці быў такі: матэматыка — 2,4, гісторыя — 3,1, геаграфія — 1,3, біялогія — 2.5, руская мова і літаратура — 1,8, беларуская мова і літаратура — 1,2, журналістыка — 1,3, правазнаўства — 3,8.**

**Трэба адзначыць, што ў апошнія гады, на жаль, назіраецца тэндэнцыя да зніжэння конкурсу на завочны факультэт, што тлумачыцца павелічэннем плана набору. Асабліва мы турбуемся за будучы набор на аддзяленне журналістыкі, з якім і без таго маюцца складанасці. Нягледзячы на абгрунтаваныя, маючыя рацыю прапановы з нашага боку, МінВНУ не пайшло БДУ насустрач і дало нам неабумоўленыя лічбы ў плане прыёму на аддзяленне журналістыкі.**

**Неабходна дадаць, што ў гэтым годзе перавага пры залічэнні ў студэнты на завочны факультэт будзе аддавацца ў першую чаргу асобам з адпаведнай сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і асобам, якія працуюць па спецыяльнасці.**

**І яшчэ. Перабудова на завочным толькі пачынаецца. У перспектыве — больш важныя і значныя змяненні ў сістэме навучання, але пасіўна чакаць і спадзявацца на іх — наўрад ці правільна. Галоўнае ў вучобе залежыць толькі ад цябе, Студэнт-Завочнік. Мы верым у цябе.**

**Л. ДАВЫДЗЕНКА,**
**прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню.**

уроки
дэмакратыі

# Ці лёгка быць дэпутатам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

Былі ў дэпутацкай практыцы Дземяшкевіча і такія выпадкі, калі прыходзілася сутыкацца з фактамі бездапаможнасці, утрымання, непрыкрытага бюракратызму. І тады яму, у мінулым воіну-інтэрнацыяналісту, кавалеру ордэна Чырвонай Зоркі, робіцца не па сабе. Армія навучыла яго прымаць самастойныя рашэнні, добрасумленна адносіцца да кожнага даручэння.

З першага універсітэцкага курса Дземяшкевіча выбралі старастам. У камітэце камсамола факультэта адказваў за акадэмічны сектар. Быў камісарам, а потым і камандзірам атрада «Рытм», у гонар якога ў цэнтры калгаса «Савецкая Беларусь» Клецкага раёна пабудаваная студэнтамі вуліца названа Універсітэцкай. Цяпер вось выбралі членам парткома БДУ і ў савет ветэранаў вайны і працы вылучылі. Там ён узначаліў секцыю воінаў-інтэрнацыяналістаў.

— Няўжо для таго, каб зразумець, якое цікавае і складанае жыццё,— гаварыў Дземяшкевіч,— абавязкова патрэбна зведаць нясцерпную смагу на горкай дарозе і пачуць свіст куль над галавой? Няўжо для таго, каб не пераводзіць час на бескарысную балбатню, бессэнсоўнае стаянне ля пад'ездаў, беспрычынныя бойкі паміж сабой, трэба перажыць страту таварыша на мінным полі? Хіба цяжка і без гэтага зразумець, што ўпустую растрачваць маладыя гады — несумленна ў адносінах да Радзімы?

Прайшло чатыры гады, як ён вярнуўся з Афганістана, а ўсё яшчэ бачацца ўзарваныя школы, галодныя чарнагаловыя дзеці, змучаныя твары старых... Пасля арміі ён ужо не мог спакойна глядзець на дзяляг, чэрствых, раўнадушных, чванлівых людзей. Таму і паступіў на юрыдычны, каб прафесіянальна рэагаваць на ўсё тое, што перашкаджае нармальна і сумленна жыць.

Незаспакоенасць душы Аляксандр зноў праявіў на апошняй сесіі Мінскага гарсавета. У зале пасяджэнняў былі ўсталяваны вольныя мікрафоны, і кожны дэпутат мог задаць прысутным службовым асобам любое пытанне. Дземяшкевіч не прапусціў гэтай магчымасці і звярнуўся да начальніка ўпраўлення капітальнага будаўніцтва:

— У мікрараёне Паўднёвы Захад-3 павінны быць пабудаваны спартыўныя пляцоўкі, але іх і ў паміне няма. Жыхары далі дэпутатам наказ дабіцца іх будаўніцтва. Наша група накіравала пісьмо у УКБ. Адтуль прыйшоў адказ, што ўсё пабудавана. Мы праверылі факты на месцы. І што ж: у некаторых дварах стаяць нейкія спартыўныя прыстасаванні. А дзе ж комплексныя пляцоўкі? Жыхары іх і ў вочы не бачылі. У сувязі з гэтым хачу спытаць: як можна было падпісваць яўна не праўдзівы адказ? Ці не такія адпіскі кампраметуюць гарадскія ўлады перад людзьмі?

Нехта сказаў пра яго: «Калючы хлопец! Цяпер вось такія вожыкі сабе дарогу прабіваюць». Спачатку крыўднымі гэтыя словы здаліся, а потым стала шкада тых «вожыкаў», якія свае калючкі на дарожцы губляюць і выкатваюцца на вялікую дарогу ўжо гладкімі, усміхаючыміся калабкамі.

— А вам, Саша, не перашкаджаюць уласныя калючкі?

— Для лагоднасці часу няма. Дэпутацкія паўнамоцтвы я хутка здам. А грамадзянскія застануцца назаўсёды.

В. МЕНЬШЫКАВА.

навіны турыстаў

# Нас вабіць рамантыка...







*НІ ПА-АСЕННЯМУ шэрае неба, ні надакучлівы халодны дождж не сапсавалі святочнага настрою. Хутка разбілі палаткі, абсталяваліся, паснедалі.*

*Адразу пасля адкрыцця злёту — спаборніцтвы.*

*Паласа перашкод сапраўды была нялёгкай. Мала хто здолеў пералезці цераз падвешанае да дрэў бервяно, праз мышалоўку, не атрымаўшы пры гэтым штрафных хвілін. Увечары — футбол і валейбол. Нават прафесійнікі «непрафесіянальных» гульняў былі цалкам захоплены вострай, цікавай гульнёй.*

*НА ДРУГІ дзень злёту, у свята, у госці да студэнтаў завіталі ветэраны — удзельнікі баёў, што праходзілі ў гэтых лясах, былыя партызаны брыгады імя Варашылава. Цікавай і карыснай была сустрэча. На святочным мітынгу павіншавалі ветэранаў сакратар камітэта камсамола БДУ А. Жук, воін-інтэрнацыяналіст, студэнт юрфака Ю. Бацян, а потым і ўсе студэнты. Замест сцэны — кавалачак сухой зямлі пад старымі елкамі. Спявалі пра вайну, пра Перамогу. Па душы прыйшліся ветэранам шчырыя студэнцкія песні.*

*Гэты дзень быў багаты і на спаборніцтвы. Напрыклад, чый абед лепшы? Аказалася, самы смачны, з фантазіяй і выдумкай — у радыёфізікаў. У конкурсе на лепшае абсталяванне лагера першымі былі юрысты. А ў спартыўным арыентаванні першае месца засталося за біёлагамі.*

*Перад сном, крыху стомленыя, сабраліся студэнты на паляне ля кастра. Спявалі, танцавалі. І стома знімаецца і не да суму.*

*Назаўтра нас чакала падвядзенне вынікаў, а гэта значыць, прыемныя хвіліны ўручэння ўзнагарод і здзіўленне — як хутка ляціць час!*

*Ваенізаваная эстафета дапамагла канчаткова вырашыць, чыя каманда мацнейшая. Суддзі канстатавалі: першыя — юрысты. Трэба дадаць, што гэта, бадай, адзіны факультэт, дзе здолелі падрыхтавацца і правесці злёт на высокім узроўні. Ад юрыстаў крыху адсталі біёлагі. Факультэт радыёфізікі заняў таксама прызавое месца — III.*

*БЫЎ ЯШЧЭ адзін дзень у кожнага удзельніка злёту, неафіцыйны, калі абмяркоўваліся галоўнае і дробязі, недахопы і ўдачлівыя знаходкі, выказваліся прапановы, як зрабіць наступны злёт лепшым.*

*Арганізацыя, нягледзячы на асобныя моманты, была ўсё ж добрай. У гэтай пэўная заслуга камітэта камсамола БДУ.*

*Летась у злёце прынялі ўдзел каманды шасці факультэтаў (для параўнання: у 1983 годзе, калі праводзіўся I злёт, на яго сабралося 11 факультэтаў).*

*— Мы ехалі раней не таму, што было такое жаданне,— тлумачыць І. Акушэвіч,— нас проста прымушалі. Зараз — усё інакш. Паехалі тыя, хто сапраўды хацеў.*

*І ўсё ж мне хочацца параіць аднесціся да ўкамплектавання каманд з яшчэ большай увагай. Выпадковыя людзі нідзе не патрэбны.*

*І яшчэ: ці не стварыць нам турысцкія клубы? Іх карыснасць — відавочная,— так лічыць і сакратар камітэта камсамола фізічнага факультэта І. Ганчаронак. Прыкладам мог бы паслужыць юрфак.*

*Звяртаюся і да тых, хто застаўся ўбаку. Таварышы географы, журналісты, хімікі — усе тыя, хто пазбавіў сябе задавальнення ад супу з яловымі іголкамі, сядзення побач з таварышам ля непагашанага вогнішча, салаўінага канцэрта, новых карысных, цікавых знаёмстваў — хіба гэта вас ужо не вабіць?*

*Спадзяюся, што ў наступным годзе прыняць удзел у злёце вашага роднага універсітэта стане для вас больш жаданым.*

**В. КАЗЛОВІЧ,**
*студэнтка факультэта журналістыкі.*

*Фота А. МАКАРЭВІЧА,*
*студэнта факультэта радыёфізікі і электронікі.*

## КВЗ: патрэбна добразычлівасць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

візійны КВЗ». Умоўна праграму ФПМ можна было б назваць «Абвяржэнне, дасланае мантажорамі тэлеКВЗ». Фізікі прапанавалі свой погляд — «Тыпавы КВЗ 60-х і тыпавы КВЗ 80-х». Бадай, гэта быў самы добры, самы вясёлы па настрою конкурс фіналу. Матэматыкі аказаліся тут мацнейшымі.

Атмасфера ў зале тым часам беспаваротна азлаблялася. Не пабаюся гэтага сцвярджэння, бо так яно і было. А калі выйшлі прадстаўнікі прэс-цэнтраў і зачыталі запіскі, дык балельшчыкаў ледзь супакоілі. Запіскі атакавалі і журы. Прапаноўвалася спыніць «жаванне гумы» у фізікаў і супакоіць «нахабных балельшчыкаў з ФПМ», і... шмат яшчэ на што звярталася ўвага журы.

# ФІНАЛ

А членам журы прыходзілася даволі складана. Каманды выконвалі сваё дамашняе заданне — «На далёкай станцыі сыйду». Студэнцкі цягнік паказалі матэматыкі. А фізікі — «краіну дурняў». Іх не зразумелі. І тыя цікавыя, станоўчыя знаходкі, што былі ў фізфака, патанулі ад нежадання ФПМ паслухаць і ўнікнуць у тое, пра што ж ідзе гаворка.

Апошняе слова ўзялі прэс-цэнтры. Яны далі адказ на ананімкі. Дакладней, паспрабавалі гэта зрабіць. Справа ў тым, што прэс-цэнтры забыліся на сваю спецыфіку: яны былі не толькі часткай каманды КВЗ, але і асобным яе органам. Яны забыліся, што апрача весялосці і знаходлівасці ім неабходны быў журналісцкі падыход. На жаль, каманды не здагадаліся запрасіць кансультантаў з журфака, якія б змаглі дапамагчы надаць прэс-цэнтру прэсцэнтраўскі выгляд.

Падлічаны, нарэшце, усе балы. 97:95 — з такім лікам каманда фізічнага факультэта перамагла каманду ФПМ. Пераможцамі конкурсу на прыз сімпатый гледачоў сталі Сяргей Варажун з ФПМ і Мікалай Ярош з фізфака.

### УРАЖАННЕ

Апошнія хвіліны гульні атрымаліся сумнымі. Не ад таго нават, што балельшчыкі прайграўшай каманды дэманстрацыйна, не чакаючы апошняга слова журы і ўручэння ўзнагарод, сталі пакідаць свае месцы. І не ад выкрыкаў тыпу: «Несправядліва!» Сумна было ад таго, што каманда ФПМ не змагла дастойна закончыць сваё выступленне. Яна аб'явіла байкот: сапернікам, якім не захацела падзякаваць за гульню; і журы — узнагароду за II месца ў КВЗ сезона 1986—87 года прыйшлося прыняць сакратару ФПМ Сашу Канашу. Ён жа атрымаў прыз прэс-цэнтра, за якім адмовіўся падняцца на сцэну ўладальнік, як, дарэчы, і ўся каманда. Яны нават аб'явілі байкот сваім балельшчыкам, бо Сяргей Варажун, «забыўся» на свой прыз сімпатый, пакінуўшы яго ў зале на раялі, прыз, які яму ўручылі ад імя яго балельшчыкаў.

Я разумею, горка прайграваць. Цяжа. Але ж ці можна было быць такім няўдзячным клубу вясёлых і знаходлівых? Куды ж падзеліся весялосць і знаходлівасць? Ці іх месца толькі на сцэне і ў час гульні і прызначаны журы?

А. Канаш, сакратар камітэта камсамола ФПМ заўважыў, што фінал не атрымаўся (дарэчы, меркаванне, што паўфіналы былі мацнейшымі, пачула я не адзін раз):

— Яму не хапіла дынамізму, свежасці,— вось таго, пра што ўсе мы гаворым.

У. Семянькоў, член журы, адзначыў:

— У ФПМ была добрая рэжысура, адрэпеціравана ўсё. Фізікам не хапіла некалькіх рэпетыцый. Але іх выказванні мелі большую сацыяльную накіраванасць.

— Мне не спадабаліся балельшчыкі і нашы, і сапернікаў,— заўважыў Мікалай Ярош.— У такой атмасферы цяжка выступаць.

— Падаваць заяўку на тэлебачанне нам яўна рана,— гаварыў старшыня журы В. У. Балашчанка.— Ідэі КВЗ быў гарантаваны поспех. Але якасць жадае лепшага. Шкада, што практычна ўхіліўся ад КВЗ наш камітэт камсамола, аргкамітэт і журы конкурсу — гэта практычна адно і тое ж. Нам, ветэранам КВЗ, прыемна было, што пра нас не забыліся. Але ж каму нам вопыт свой перадаць? Гэта ўжо камітэт камсамола павінен падумаць.

— Мне здаецца, што да фіналу каманды «выдахліся». Мо не варта такая напружанасць конкурсу? І яшчэ: у 70-я гады, калі я сам гуляў у КВЗ, зала была дабрэй, чым цяпер,— зазначыў А. А. Ягораў, член журы, былы капітан каманды КВЗ матэматычнага факультэта.

Апошнімі пакідалі залу Ірына Крыловіч, Анжэла Ярашэвіч, Андрэй Яноўскі, Валера Шамрыла, Раман Зуеўскі, Мікалай Ярош — каманда КВЗ фізфака. Непрыдападобнай здалася цішыня залы. І я ўспомніла запіску, што прыйшла ў журы: «Мы прыйшлі да вываду, што не ўмеем слухаць тое, што яны ўмеюць гаварыць. Балельшчыкі». Кінулася ў вочы маленькая дробязь: пакінутыя паперы і плакаты на той палове, дзе хварэлі за ФПМ. А з дробязей складаецца наша добразычлівасць. Як яе не хапала першаму фіналу КВЗ, што аднавіўся ва універсітэце праз даволі працяглы час!

С. ГОГАЛЬ,
наш кар.

цвярозасць — норма жыцця

# П'янству — стоп-сігнал!



ЗДАЕЦЦА, зразумела, што універсітэт і п'янства — дзве несумяшчальныя, супрацьлеглыя рэчы. Але для некаторых, і гэта прыходзіцца з абурэннем канстатаваць, цвярозасць яшчэ не стала нормай жыцця. У красавіку — маі органамі аховы правапарадку ў нецвярозым стане былі затрыманы:

Я. Р. ГРЫШКОЎ — старшы інжынер ВЦ;

АЛЬБІНА РАДРЫЧАС ДЖОННІ — студэнт падрыхтоўчага факультэта;

А. А. ПАПКО — студэнт IV курса радыёфізічнага факультэта (затрымліваўся двойчы — !!);

В. М. КАЛЕСНІКАЎ — асістэнт радыёфізічнага факультэта.

Мал. В. ЯЦКОЎСКАГА.




## «ГАРЫМ!»

«16 сакавіка 1987 года ў 3 гадзіны 30 мінут у пакоі № 71 інтэрната № 1 па вул. Свярдлова, 34, здарыўся пажар. У выніку пажару згарэла маёмасць пражываючых, мэбля, закураны калідор III паверха. Універсітэту нанесена матэрыяльная страта ў суме 390 рублёў.

Следства выявіла, што 16 сакавіка 1987 года ў 00 гадзін 30 мінут слухач падрыхтоўчага аддзялення С. Межнін, які пражывае ў пакоі № 75, перанёс электранагравальны прыбор са свайго пакоя і ўключыў яго ў электрасетку ў пакоі № 71, устанавіўшы каля згараемых прадметаў. У пакоі з Межніным знаходзілася студэнтка V курса В. Шчарбакова. А чацвёртай гадзіне ночы В. Шчарбакова і С. Межнін убачылі, што ў пакоі здарыўся пажар, які быў ліквідаваны выкліканай пажарнай брыгадай»... — радкі з загада па Белдзяржуніверсітэту № 186 ад 3.04.1987 г. Прачытаем яго далей.

«...Выхаваўчая работа ў інтэрнаце праводзілася на нізкім узроўні... Студэнтамі не выконваўся ўнутраны распарадак пражывання ў інтэрнаце. Так, студэнтка V курса В. Шчарбакова ў начны час знаходзілася ў пакоі № 71 разам са слухачом падрыхтоўчага аддзялення С. Межніным, а студэнтка IV курса А. Гіпава ў пакоі № 75 са слухачом падрыхтоучага аддзялення Д. Змушко...»

## РАННЯЕ ДЗІЦЯ

ПЛАКАЦЬ ХАЦЕЛАСЯ? Не, слёзы не ліліся з апухлых вачэй, як некалькі дзён назад. Вочы глядзелі ў блакітнае неба, у якім звінелі жаўрукі, па паветраных нябачных дарогах ляцелі дадому пацеркі птушак і купалася пяшчотнае сонейка. Не разумелі вочы гэтай усеагульнай радасці, бо нічога не бачылі. Што было на душы ў застылай дзяўчыны? Боль. Такі боль, што выказаць нельга. Хацелася драпаць гэтую душу і забывацца ў яшчэ большым болі. Ах, калі б гэта прынесла аблягчэнне! А болей нічога не хацелася. Усё стала абыякава, страціла памеры: аб'ём, фарбы, прызначэнне... Нібыта гэта не той, некалі радаваўшы і звыклы, кожны дзень адначасова непаўторны свет, а далёкае-далёкае — ад яе. І ўсё, што зараз адбывалася, здавалася такім жа далёкім. Ах, калі б гэта было не з ёю. Хаця не, нікому такога жадаць яна не хоча.

Гэтага пытання яна чакала: чаму вы не хочаце выходзіць замуж? Дзіўнае пытанне. Навошта чужой жанчыне лезці ў яе душу? Няўжо ўрача можа хваляваць нечае асабістае жыццё? Дзяўчына маўчала, апусціўшы галаву. Пытанне паўтаралася больш настойліва. «Чаму?» «Чаму?» Колькі можна яе пра гэта пытаць?

— Не люблю яго.

— Вось як?! Не любіце, а жылі? Навошта?

Надакучлівасць урача пачынала нерваваць. Кепска і без яе.

Да гэтага кабінета яна адчувала сябе даволі ўпэўнена, меркавала: рашэнне, якое прымае,— адзіна правільнае. Ведала, што на нікому не патрэбныя пытанні знойдзе нікому не патрэбныя адказы, толькі б хутчэй адчапіліся і дапамаглі ў тым, за чым яна сюды звярнулася. Дзяўчына была перакanана: гэта так проста — калі не любіш чалавека, тады не хочаш за яго ні замуж, ні дзіцяці.

Цяпер упэўненасць разляцелася, як пудра з пухаўкі, ледзь на яе дзьмухнулі, І сапраўды, навошта жылі разам?

Калі яна западозрыла, што звыйчайны ход рэчаў раптам катастрафічна, незвяртальна змяняецца, уздрыганулася. І галоўнае — чаму так недарэчы! Толькі-толькі пачалі сустракацца з Сашкам, з мілым і разумным, які нават падарыў ей ружу... Жыццё набывала, дакладней, хацела набыць сэнс. А сэнс — вось ён які — паклікаў і тут жа схаваўся.

Трэба было нешта рабіць. Што?

Юлька і Светка, сяброўкі па інтэрнату, выслухалі, адкрыўшы раты. Не кожны дзень даводзіцца такое чуць. Тым больш, што не чакалі ад яе, Іркі, якую лічылі дзяўчынай сціплай і закамплексаванай. Вось выдала дзеўка!

Юлька заняла пазіцыю: мы — за дзяцей! Нават калі яны без бацькі, усё роўна гэта — дзеці! Светка наадварот, жахнулася ад сітуацыі і шкадавала ад усяго сэрца: бедная, цяпер у цябе, можа, ніколі не будзе дзяцей!

Юлька гаварыла:

— Ні ў якім выпадку нічога не рабі. Выклікай бацьку дзіцяці на размову. Калі трэба будзе, пагражай, плач, крычы, але рві кіпцюрамі шчасце будучага дзіцяці. Калі ён адмовіцца — не губляйся! Мы яму такое зробім! На бюро камітэта камсамола выклічам, перад усім грамадствам абняславім! Бацькам паведамім! Пабачыш — нікуды не дзенецца. Сама зразумей: вучыцца хоча — хоча, з камсамола каб выперлі — не хоча. Ды што ён — дурань — кар'еру сабе рушыць? Нарэшце, праз суд прыбяром да рук. Эксперты дапамогуць, сведкаў знойдзем.

- Юлька, не мялі лухту,— крычала Светка.— Якое дзіця? Якая экспертыза? Няўжо нельга без гэтага? Каму патрэбна гэта дзіця? Такому татулю? Такой матулі? Ты паглядзі на яе ўважліва — толькі-толькі 18 грукнула, рост — метр з нечым, вага — пяро вераб'інае. Ей яшчэ розуму набірацца. А ты цётку з яе зрабіць хочаш у 18 гадоў. А вучыцца калі будзе? А жыць дзе? На што?

А бацькам як у вочы пaглядзіць? Яны лісты штодня дасылаюць: «Ірок, снедай лепш, яблыкі купляй, пра грошы не думай — мы табе 30 рублёў... Галоўнае — вучыся, дачушка, добра, гонар ты наш». А Ірок? «Грошай шліце болей, я цяпер за дваіх павінна есці, унукам ці унучкай вас адару...»

— Не-е, Светка, не дурніся. Дзяцей берагчы трэба! Ірка, слухай мяне далей. Калі ён, гэты падлюка, усё ж знойдзе шляхі і зможа адмовіцца — мы твайго малога ўсім пакоем вырасцім.

— Дзяўчаткі, не сварыцеся. Пра што гэта вы? Лепей бы пацікавіліся, а ці люблю я яго? Я ж так, з цікавасці з ім, можна сказаць. Разы два сустрэліся. Ён мне наогул брыдкі, ён — шкарпэткі... не мые... А вы: «дзіця, дзіця». Я ўсе прадумала. Ні-ко-га не будзе! Не хачу!

## КАХАННЕ З... АГЛЯДКАЙ

— ТЫ? ЦІ НЕ ТЫ? Не пазнаць. Прыгожая такая стала! Ці не закахалася раптам?

— Угадала. Няўжо бачна?..

— А чаго ўздыхаеш цяжка? Жанчына звычайна ўздыхае, калі кахае няшчасна. Спадзяёмся, не пра цябе?

—...Не ведаю. Знешне ўсё добра. А ўнутры... Каб хтосьці сказаў, што некалі так буду мучыцца, не паверыла б.

— Што так?

— Можа, ты і не зразумееш мяне, я сама не разумею, як гэта здарылася. А можа, мае мучэнні — надуманыя?

Мы крочым з маёй знаёмай у парк. Па яе неспакойнаму твару не цяжка заўважыць — чалавек мучыцца сапраўды.

— Напэўна, трэба спачатку... Ты сама памятаеш, якая я прыехала ў Мінск: усяго баялася. Горад вабіў і адпіхваў. Тузін комплексаў нажыла. Хачу пайсці на дыскатэку, апрануць што, не ведаю, а раптам буду выглядаць пудзілам. Хлопец звернецца да мяне з дробязным пытаннем, а я маўчу, чырвоная. Не магу вінаваціць у гэтым бацькоў, яны ж імкнуліся выхоўваць мяне. Перастараліся, папэўна. Берaглі. Паехаць куды-небудзь трэба было — сапраўдны сход наладжвалі з абмеркаваннем усіх дробязей, быццам я дачка не калгасніка, а мільянера, і за мною ганяецца банда, каб украсці і прадаць — за карову хіба. А колькі слёз маці праліла, калі я на экзамены ехала. Развітваліся, быццам назаўсёды. І тысячу разоў паўтаралі: «Ты ж глядзі там, у горадзе, з хлопцамі не сябруй. Яны добраму не навучаць! А калі што — ты нам не дачка. Мы цябе і ведаць не захочам!»

Першы год старанна памятала ўсе наказы і парады. А потым... Быццам мяне падмянілі. Абрыдла хавацца ад людзей. І пачала барацьбу з комплексамі. Зацікавілася шмоткамі, касметыкай, прычоскамі, ну, зразумела, хлопцамі. Праўда, яны мной чагосьці не хацелі цікавіцца...

Яна маўчыць.

— Закахалася. Упершыню. Нейкае памутненне розуму. Праўда, як высвятлілася, занадта позна, ён мне так і сказаў: «Прабач, ты добрая дзяўчынка, але падабаецца мне іншая». Здаецца, узяла б востры-востры нож і... Жыццё б за яго аддала. Нехта параіў: клін клінам. І пачалося: Генка, Ігар, Жэнька, Віцька... Адзін за адным. Ведала: нічога ім ад мяне не трэба, акрамя таго, каб «гарбатай пачаставацца». Але так хацелася забыцца, каб нічога не адчуваць, нічога не помніць, не верыць, не спадзявацца.

Толькі цяпер адчуваю, што з сабой нарабіла. Абнішчала. Вылушчыла душу.

Цяпер у мяне ёсць Ён. Доўгачаканы, якога... не дачакалася. Сэрца рвецца да яго, а нешта адцягвае і нібыта д'ябал нашэптвае: жартуе ён з табою. Не патрэбна ты яму.

Раней нават ганарылася: усё ведаю, вопыт маю. Ніхто мне ніколі не зманіць — магу сама кінуць у любую хвіліну без шкадавання. А цяпер не ведаю, як пазбавіцца ад такога вопыту. Цяжкая ношка аказалася...

— Ну, а ён? Разумее цябе?

— На жаль. Ён сам такі. Ён сам не верыць, што можна быць каханым і кахаць не для забавы, часова, а усур'ёз. Вось так.

Што можна было адказаць маёй знаёмай? Яе каханне задыхалася без надзеі, без упэўненасці, што надзея абавязкова з'явіцца. Добра, калі яна ўсе гэта зразумее. І мне чамусьці верылася: яны ўдваіх знойдуць шляхі адзін да аднаго...



Мал. В. ЯЦКОЎСКАГА.

## НАВОШТА МЫ АДЗІН АДНАМУ?

ЯКАЯ СУВЯЗЬ паміж расказанымі нявыдуманымі гісторыямі? Сюжэтнай не шукайце, яе няма. Але калі прыглядзецца, можна заўважыць, што аб'ядноўвае іх не толькі тое, што ўдзельнікамі падзей з'яўляюцца студэнты. Ва ўсіх выпадках мне бачыцца адна галоўная рыса ў паводзінах герояў — лёгкадумнасць. Лёгкадумнасць у адносінах да сябе, да іншых, якая, між тым, не настолькі бязвінная і небяспечная: яе вынікі караюць і вучаць, прымушаюць задумацца.

Са старонак друку, на камсамольскіх сходах мы прывыклі гаварыць пра сумленнасць чалавека, яго абавязак, пра тое, якую ён вядзе грамадскую работу, як вучыцца, ці актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах. Так, усё гэта — неабходныя элементы выхаваўчай працы з моладдзю, якія дапамагаюць ствараць будаўніка нашага грамадства. А калі і заходзіць гаворка пра каханне, адносіны паміж юнаком і дзяўчынай — зрэдку яна ўдаецца шчырай і разумнай, з развaжаннямі, адкрыта. А між тым гэтая галіна чалавечых адносін не менш важная для грамадства, чым астатнія. І, як мне здаецца, мы яшчэ проста не навучыліся шырока гаварыць на гэтую тэму, якую нярэдка называюць «казытлівай».

Інтымны свет кожнага чалавека — вельмі складаны і супярэчлівы. І галоўнае — абавязкова асабісты. Імкнуцца пранікнуць у яго, вынясці на суд грамадскасці — па меншай мер бестактоўна. Таму не зразумейце мяне няправільна, што я — за анатаміраванне асабістага ўсімі і для ўсіх. Я — за тое, каб адкрыта разбіраць тыя з'явы ў маладзёжным асяроддзі, якія па сваёй сутнасці і прыродзе супрацьлеглыя духоўнаму, але, нягледзячы на пэўную адмоўнасць, трывала існуюць і павольна ўжываюцца ў інтымныя адносіны паміж Ім і Ёю: лёгкадумнасць, цынізм, спажывальнасць, разлік, карыслівасць, разбэшчанасць, хлусня...

Не ведаю, як цябе, чытач, а мяне гэта вельмі хвалюе. Неўзабаве прыходзіць думка, што свабоды выбару, прадастаўленыя самім часам маладым людзям, не столькі спрыяюць знайсці Свайго чалавека, колькі перашкаджаюць, збіваюць са шляху гэтага пошуку ці падаўжаюць яго. Чаму?

Нельга сцвярджаць, што нармальны чалавек знаходзіць сваё шчасце толькі ў рабоце ці грамадскім жыцці. Без кахання нельга выявіць сябе поўнасцю, і нават даведацца: «Хто я такі і навошта?» Аднак тое, як назіраемыя 18—22 гадовыя ставяцца да кахання і любога з яго праяўленняў, выклікае і здзіўленне, і абурэнне, і збянтэжанасць. Дарэчы, некаторыя з маіх знаёмых (ды і з вашых, успомніце!) без доўгіх выганняў для сябе вырашаюць, што спакойна маглі б выйсці замуж ці ажаніцца без пачуцця; хаця ўсе ў сваім ідэале бачаць (бачылі) сябе каханымі і кахаючымі. Разрыў паміж ідэальным і рэальным? Але як не разумець, што ідэал ніколі не наблізіцца, калі спадзявацца толькі на удачу, на «пасля», калі не крочыць да яго, нават марудна і з цяжкасцямі?

Як кахаць, каго? Для многіх гэта не праблема ў маім разуменні. Бо што можна сказаць пра чалавека, які сумуе па сапраўднаму пачуццю і са скаргамі расказвае, які ён «добры, а яго ніхто не разумее», што «супрацьлеглая палова — вельмі прымітыўная і зло толькі ад яе» і г. д.; і тым часам сустракаецца з гэтай «супрацьлеглай паловай» — так, для спробы, часова, ад нечага рабіць. Маўляў, калі ж прыйдзе сапраўднае, папярэдняе гэтаму перашкодай не з'явіцца. Ці так?

Асобу фарміруюць не толькі яе ўяўленні, імкненні, жаданні, але і штодзённыя ўчынкі. Думаць, што нешта забудзецца, з цягам часу адыдзе, не наносячы шкоды ні табе, ні твайму будучаму — наіўна. Імкнучыся набыць пэўны жыццёвы вопыт, які так уздымае нас у вачах таварышаў, ці не існуе пагроза ў спешцы, у дробязнасці нашых учынкаў згубіць, растраціць сябе? І калі прыйдзе тое сапраўднае, ці зможам мы гэта ацаніць і зразумець, ці здолеем узняцца да кахання?

А. ВІХРОВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПЛ імя Я. Коласа.
Зак. 1582.
21 мая 1987 г.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.